# ТЭРАТАМОРФНЫЯ І МІКСАНТРАПІЧНЫЯ ІСТОТЫ МІФАЛОГІІ Ў СЕРЫІ РАМАНАЎ ПРА ГАРЫ ПОТЭРА

**М. А. Драгун**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь, macviejdrahun@gmail.com*

Адным з асноўных аб’ектаў даклада з’яўляецца міф, яго асэнсаванне ў старажытныя часы і ў сучаснасці. Міф, у прыватнасці антычны міф, – універсальны код, які зразумелы большасці людзей, таму з’яўленне міфалагічных вобразаў на старонках сучаснай літаратуры абсалютна заканамернае. Аналізуецца эвалюцыя тэратаморфных і міксантрапічных істот антычнай міфалогіі на прыкладзе апісанняў антычных аўтараў і серыі раманаў пра Гары Потэра.

***Ключавыя словы:*** тэратамарфізм; міксантрапізм; грэчаская міфалогія; Гары Потэр.

Уяўленні пра тэратаморфных і максантрапічных істот складваюцца ў ранні перыяд міфалогіі – дакласічны. Іншая назва гэтай міфалогіі – хтанічная – паходзіць ад грэчаскага «χθών» – «зямля», бо ў архаічны перыяд зямля ўяўлялася ўсеагульнай маці, якая нараджае і гадуе. Але ў такім выпадку і ўся прырода, і ўсё на зямлі з’яўляецца жывым [9, с. 20]. Такое ўяўленне пра непадзельнасць прыроды і татальную ўзаемасувязь усяго жывога і нежывога нараджае тэратаморфныя вобразы. Слова тэратамарфізм паходзіць ад старажытнагрэчаскага «τέρας» – «пачвара», але разам з тым і «цуд». У гэтай дыхатаміі адкрываецца сутнасць тэратамарфізму. З аднаго боку першабытны чалавек, цалкам уключаны ў прыроду, успрымае яе як нешта дысгарманічнае, пачварнае і небяспечнае [9, с. 22], што выцякае ў з’яўленне ў міфалогіі тэратаморфных істот. Гэтыя істоты (Тыфон, Яхідна, Лернейская гідра, Цэрбер і г.д.) не ўнушаюць нічога, акрамя страху. Але разам з тым архаіка мае своеасаблівую прывабнасць менавіта праз сваю дзікасць, спалучэнне пачварнасці і чароўнасці, яна адначасова адштурхоўвае і прыцягвае. Голас сірэн чаруе, вабіць да сябе, але пры гэтым ён толькі сродак, каб заманіць маракоў, а потым забіць іх.

Архаічная міфалогія дасягае сваёй прыгажосці сваёй бязвобразнасцю. Сваю негатыўную канатацыю тэратаморфныя істоты набываюць збольшага ў перыяд алімпійскай міфалогіі, дзе новае ўладкаванне пантэону імкнецца прынесці гармонію і прыгажосць, а ранейшых, жахлівых істот, якія не ўпісваюцца ў рамкі прыўкраснага, знічтожыць.

Самога першабытнага чалавека не варта ўяўляць сабе запужаным прыродай дзікуном. Ён быў часткай прыроды і вучыўся арыентавацца

ў гэтым космасе. Тым не меней уласнае «я» яшчэ не выдзелілася, а псіхалагічныя функцыі чалавека яшчэ былі спалучаныя з функцыямі біясацыяльнымі.

Першабытная свядомасць у сваіх спробах патлумачыць наваколле робіць усе з'явы матэрыяльнымі, жывымі і часам разумнымі. У такім разуменні свету адухаўляецца ўсё: і камень, і жывёла, і расліна. Сам чалавек не аддзелены ад тых жа жывёлы і расліны, таму адбываецца змяшэнне вобразаў прыроды і чалавека. Адсюль вынікае паняцце міксантрапіі.

Міксантрапія – спалучэнне ў істоце рысаў чалавека і жывёлы. Класічнымі прыкладамі міксантрапічных істот з'яўляюцца кентаўры, якія маюць прыроду чалавека і каня. Гэты хтанічны свет засноўваўся на такіх «вечных законах», якія патрабавалі «пастаянных цудаў і ператтварэнняў, пастаянных звышнатуральных злучэнняў і разлучэння, нараджэння і смерці» [5, с. 302].

Паступова з пераходам ад матрыярхату да патрыярхату і зменай сацыяльнага ладу чалавечая свядомасць рацыяналізуецца, а сам чалавек пачынае аддзяляць сябе ад прыроды, усведамляць сябе як асобную адзінку. Падчас пераходу да гераізму ў міфалогіі чалавек вучыцца паступова змагацца з выклікамі прыроды. Але стварэнні хтанічнага перыяду не знікаюць з пазнейшага міфалагічнага наратыву.

Тэратаморфныя і міксантрапічныя істоты шырока прадстаўленыя ў літаратуры, не абмяжоўваючыся выключна антычным перыядам, але даходзячы ажно да нашых дзён. Традыцыя пачынаецца ад першых літаратурных помнікаў Старажытнай Грэцыі, «Іліяды» і «Адысеі» Гамера і «Тэагоніі» Гесіёда, і цягнецца да сёння. На прыкладзе трох істотаў, якія сустракаюцца ў розных частаках серыі раманаў пра Гары Потэра, можна прасачыць, як змяніліся ўяўленні пра звыклыя вобразы.

Напрыклад, кентаўры – паўлюдзі, паўконі, нашчадкі Іксіёна і Нефелы [2, с. 258]. Кола міфаў, дзе з'яўляюцца кентаўры, можна акрэсліць найперш кентаўрамахіяй, чацвёртым подзвігам Геракла і смерцю Геракла. У літаратурным варыянце міф пра вайну кентаўраў і лапіфаў паказвае Апаладор: «Тэзей далучыўся да Пірыфоя, калі той уступіў у вайну з кентаўрамі. Кентаўры былі запрошаныя на вяселле Пірыфоя і Гіпадаміі як яе сваякі. Але нязвыклыя да віна, яны ап'янелі, прагна глытаючы яго, і, калі з'явілася нявеста, кентаўры паспрабавалі згвалціць яе. Тады ўзброены Пірыфой разам з Тэзеем пачаў з імі бойку і Тэзей забіў шмат з іх» [10, с. 147].

Кентаўры паказваюцца як істоты дзікія, падкія да віна, што і з'яўляецца звычайна пачаткам канфліктаў з людзьмі. Згодна з традыцыяй Дыядор апісвае кентаўраў у цыкле пра подзвігі Геракла: «Калі ж моцны

водар настаялага віна даляцеў да кентаўраў, яны былі прыведзеныя ў шаленства» [26, с. 381]. У бітве герой забівае шматлікіх кентаўраў, астатнія пускаюцца на ўцёкі. Сярод загінулых ёсць і кентаўр Херон: «Гэтаксама Геракл стрэлам з луку выпадкова забіў кентаўра Херона, паважанага за ягоныя здольнасці да лекавання» [15, с. 385].

Херон у класічнай сваёй рэпрэзентацыі вучань Апалона і Артэміды, а сам – настаўнік шматлікіх герояў, у тым ліку і Ахіла, пра што расказвае Гамер у «Іліядзе»: «Ты вучыўся ў Ахіла лекаванню, якому, як кажуць людзі, яго навучыў найлепшы з кентаўраў Херон» [12, с. 277].

Такое апісанне выбіваецца з вобразу тых ап'яненых кентаўраў, якія выкрадалі Гіпадамію ці біліся з Гераклам. Гэтая розніца ў паводзінах кентаўраў будуецца на дваістым успрыняцці сіл прыроды, якія кентаўры сімвалізуюць. З аднаго боку гэта ўвасабленне дзікасці і хаатычнасці прыроды, а з іншага – яе старажытнай мудрасці і гармоніі.

Гэтую ж традыцыю працягвае і Джаан Роўлінг, але крыху мяняе акцэнты. Знаёмства з кентаўрам адбываецца ў першай кнізе ў цыкле пра Гары Потэра падчас паходу герояў у Забаронены лес. Першага кентаўра, якога яны сустракаюць, завуць Ронан. Роўлінг апісвае яго выгляд так: «І тут на паляну выйшаў... чалавека або конь? Зверху да пояса – чалавек, з рудымі валасамі і барадой, але ніжэй за пояс ён меў бліскучае цела гнядога каня з доўгім рудаватым хвастом» [6, с. 269].

Знешняе апісанне адпавядае класічным уяўленням пра кентаўраў. Аднак майстэрства лекавання змяняеца на здольнасць да прароцтваў і варажбу па зорках. Ронан, а потым і Бэйн кажуць адную і тую ж фразу: «Марс сёння яркі» [6, с. 270]. Так яны прарочылі Другую магічную вайну. Вельмі характэрна выказваецца пра гэтых істот Хагрыд: «Ніколі не спрабуй атрымаць нармальны адказ ад кентаўра. Чортавы звездары. Усё, што бліжэй да Зямлі за Месяц, іх не цікавіць» [6, с. 271]. Магчыма, такая змена абумоўлена змяненнем успрымання антычнай міфалогіі ў сучаснасці, яна як бы з зямнога і блізкага, то-бок з таго, чым можна карыстацца і мець відавочную карысць, як лекаванне, пераносіцца ў разрад тэарэтызаванага і аддаленага. Роўлінг паказвае гэтую дваістасць кентаўраў, не раздзяляючы іх на ўмоўных дзікіх кентаўраў і херонаў, а спалучаючы абодва «тыпажы» ў агульным вобразе кентаўра. Не разводзячы такім чынам дзве састаўныя прыродныя сілы, як гэта мела месца ў антычнай міфалогіі, Роўлінг трансфармуе вобраз кентаўра у больш сучасны і складаны, але, што парадаксальна, больш зразумелы.

Канфлікт кентаўраў і людзей у антычнай міфалогіі, які праяўляецца праз варожасць, у Роўлінг праяўляецца праз ксенафобію. Так, калі Фірэнцы вязе Гары Потэра на спіне, Бэйн раззлавана кажа: «Фірэнцы! Што ты робіш? У цябе на спіне чалавек! Табе не сорамна? Ты што, нейкі

мул?» [6, с. 274]. У кентаўраў прысутнічае комплекс таго, што іх успрымаюць як жывёл, і, як можна зразумець у наступных кнігах, небеспадстаўна. Знявага з боку людзей прыводзіць да адчужанасці кентаўраў ад свету людзей: «Што нам да гэтага? Кентаўраў турбуе толькі тое, што прадказана! Не наша гэта справа – бегаць туды-сюды, як аслы, за людзьмі, якія заблукалі ў нашым лесе» [6, с. 275].

Больш падрабязна тэма ксенафобіі раскрываецца ў пятай кнізе, калі прафесарам прароцтваў становіцца кентаўр Фірэнцы, што з’яўляецца алюзіяй на Херона. Ён настаўнік для Гары, як і Херон для герояў. Яшчэ адно пераламленне міфа, а менавіта выкраданне Гіпадаміі, можна знайсці ў канфлікце з Амбрыдж. Але ў рамане напад кентаўраў становіцца вынікам не ап’яненасці і неўтаймаванасці, але правакацыі самой Амбрыдж: «Брыдкія бруднакроўкі! – яна пракрычала, прыціскаючы рукі да галавы, – Пачвары! Бескантрольныя жывёлы!» [14, с. 755].

Такая агрэсія і становіцца прычынай выкрадання: «Ён убачыў сполах чырвонага святла і зразумеў, што яна паспрабавала аглушыць аднога з іх. Потым яна вельмі гучна закрычала. Выцягнуўшы галаву, Гары ўбачыў, як паднятая высока ў паветры Амбрыдж выкручвалася і страшна крычала» [14, с. 755].

Міфы, якія мы разгледзелі, адносяцца да класічнай міфалогіі, што тлумачыць негатыўнае стаўленне да міксантрапічных істот, у тым ліку і варожасць людзей да кентаўраў. Алімпійская міфалогія імкнецца або падпарадкаваць, або знічтожыць усё, што не можа звацца цалкам антрапаморфным, імкнучыся да гармоніі і свайго паняцця прыгажосці. Гэтае памкненне абумоўлена міфалагічным уладкаваннем, дзе новыя багі змяшчаюць старых.

Іншае пытанне: чым жа абумоўлена такое пераўладкаванне ў міфалогіі? Ці не страхам і, як вынік, нянавісцю да іншага і непадобнага? Джаан Роўлінг у сваіх раманах пакідае і сам канфлікт, і міфалагічную форму, але паказвае іншыя праявы ксенафобіі, якія мімікруюць пад больш гуманныя, то-бок псіхалагічныя, але для некаторых персанажаў (накшталт Амбрыдж) становяцца падставай для праяў фізічных.

У чацвёртай кнізе серыі «Гары Потэр і Келіх агню» фігуруе яшчэ адна міксантрапічная істота. Гары Потэр удзельнічае ў Турніры Трох Чараўнікоў, дзе апошнім выпрабаваннем стаў лабірынт, унутры якога былі розныя магічныя істоты. Адной з такіх была Сфінкс.

У антычнай міфалогіі Сфінкс звязана найперш з Фіванскім цыклам, з міфам пра Эдыпа. Пра Сфінкс у кантэксце гэтага міфа таксама згадвае Сафокл у трагедыі «Цар Эдып»: «Пявучы Сфінкс сваімі хітраспевамі змушаў нас думаць толькі пра штодзённае» [8, с. 100]. Роўлінг не адыходзіць далёка ў знешнім апісанні Сфінкс: «Гэта была Сфінкс. Яе цела

нагадвала вялікага ільва: лапы з даўгімі кіпцюрамі, доўгі жаўтаваты хвост з карычневым кутасам на канцы. Але яе галава была жаночай. Яна звярнула на яго свае доўгія, мігдалепадобныя вочы. Ён няўпэўнена падняў палачку. Але яна не збіралася нападаць, а толькі хадзіла ўзад-уперад, закрываючы праход» [13, с. 628].

Гэтая Сфінкс таксама загадвае загадкі, але ў кнізе істота ўсё ж больш літасцівая і дае шанец адмовіцца ад выпрабавання і застацца пры гэтым жывым: «Не, пакуль не адкажаш на маю загадку. Адгадаеш – дазволю прайсці, не – нападу, прамаўчыш – дазволю сысці цэлым» [13, с. 629]. Да таго ж Сфінкс тут нельга назваць адмоўным персанажам, яна дапамагае і ўвогуле даволі прыхільная да Гары: «Яна падміргнула яму, усміхнулася і паўтарыла загадку» [13, с. 629]. А калі Гары адгадвае загадку, спакойна саступае: «Сфінкс шырока ўсміхнулася, паднялася, выцягнула пярэднія лапы і адышла ўбок, даючы яму прайсці» [13, с. 630].

Сярод міфалагічных істот у кнігах прысутнічаюць таксама і тыя, у каго не маецца антрапаморфных рыс. У першую чаргу гэта сабака Пухнацік, які з’яўляецца алюзіяй на антычнага Цэрбера. Трыдыцыйна Цэрбер – вялізны сабака з трыма галавамі. Але, напрыклад, у «Тэагоніі» Гесіёда ў ахоўніка царства мёртвых на 47 галоў больш, чым мы звыклі: «Тыфон... уступіў у сувязь з ёй (Яхіднай)... І тады яна парадзіла неапісальнага і няўяўнага Цэрбера, дзікага, меднагалосага сабаку Аіда, пяцідзесяцігаловага, магутнага і бязлітаснага» [11, с. 20].

У Цэрбера Вергілія роўна тры галавы: «Аграмадны Цэрбер, жахлівы з выгляду, сустрэўшы іх у пячоры, выбухнуў брэхам з усіх трох галоў, які раздаўся эхам па ўсёй прасторы. Пачвара, звар’яцелая ад голаду, адкрыўшы свае тры раты, праглынула прынаду; тады ягонае вялізнае аслабелае цела звалілася на зямлю, распрастаўшыся на ўсю даўжыню пячоры» [16, с. 202].

У кнізе «Гары Потэр і Філасофскі камень» Пухнацік вельмі сходны з апісаннем рымскага паэта: «Яны глядзелі проста ў вочы жудаснаму, гіганцкаму сабаку – сабаку, які запаўняў усю прастору паміж столлю і падлогай. І яшчэ ў яго было тры галавы. Тры пары шалёных, вырачаных вачэй; тры раты з жаўтлявымі ікламі, з якіх слізкімі вяроўкамі звісала сліна» [6, с. 174].

Роўлінг пераносіць асноўную функцыю Цэрбера – ахоўніка Аіда, царства мёртвых, у сваю кнігу: Пухнацік таксама ахоўвае праход, але да філасофскага каменя. З кнігі мы можам даведацца не толькі, для чаго Пухнацік у Хогвартсе, але і адкуль ён. Гэтую інфармацыю выдае Хагрыд: «Ну так... гэта ж мой сабака... купіў яго ў аднаго хлапчука з Грэцыі, якога сустрэў летась у пабе...» [6, с. 206]. Наўрад ці, канешне, сам Геракл

прыцягнуў сабаку да Хагрыда, але такая маленькая дэталь адразу скіроўвае думку ў правільны бок.

Прайсці Пухнаціка даволі лёгка, калі ведаць адзін сакрэт: «Ён паднёс Хагрыдаву флейту да вуснаў і падзьмуў. Ніякай сапраўднай мелодыі не атрымалася, але з першай ноты вочы жывёліны пачалі зноў зліпацца. Гары дзьмуў бесперапынку. Паступова сабачы рык сцішыўся, звер захістаўся, упаў на калені, пасля паваліўся на зямлю і глыбока заснуў» [6, с. 293]. Тут мы назіраем алюзію на міф пра Арфея, які «не толькі зачараваў перавозчыка Харона, пса Кербера і трох суддзяў мёртвых сваёй горкай музыкай, але і часова спыніў пакуты асуджаных» [2, с. 114].

Так мы падыходзім да пэўнай заканамернасці развіцця міфалагічнага вобразу: міксантрапічныя істоты набываюць выразныя характары. Кентаўры, у якіх чалавечае дамінуе, становяцца больш цывілізаванымі, іх мысленне і светаўспрыманне ўскладняюцца, з'яўляюцца знешнія і, што важна, унутраныя канфлікты. Сфінкс, у якой чалавечай часткі значна менш, не набывае такога развіцця, але і знешнія рысы і паводзіны гуманізуюцца, яе львіная частка, адамашніваецца, хутчэй, да кашэчай. Цэрбер таксама становіцца падобны да свойскага сабакі, які хоць і захаваў жахлівыя абрысы, але яўна згубіў свой тэратаморфны і хтанічны жах.

І кентаўры, і Сфінкс, і Пухнацік у раманах Роўлінг не проста копіі сваіх антычных папярэднікаў. Роўлінг у адных выпадках развівае і пераасэнсоўвае некаторыя міфалагічныя вобразы, у другіх – умела ўплятае сюжэты міфаў у агульны аповед, захоўваючы такую неад'емную частку еўрапейскай культуры, як антычнай спадчына.

## Бібліяграфічныя спасылкі


1. *Альбидель М. Ф.* В магическом круге мифом. Миф. История. Жизнь. Санкт-Петербург : Паритет, 2002.

2. *Грейвс Р.* Мифы Древней Греции. М. : Иностранка, Азбука-Аттикус, 2014.

3. *Лосев А. Ф.* История античной эстетики : в 8 т. М. : АСТ, 2000. Т. 8 : Итоги тысячелетнего развития.

4. *Лосев А. Ф.* Античная мифология в её историческом развитии. М. : Государственное учебно-педагогическое издательство Министерства Просвещения РСФСР, 1957.

5. *Лосев А. Ф.* Бытие. Имя. Космос. М. : Мысль, 1993.

6. *Роўлінг Дж.* К. Гары Потэр і Філасофскі Камень. Мінск : Янушкевіч, 2020.

7. Словарь античности. Пер. с нем. / ред. В. И. Кузищин [и др.] ; сост. Й. Ирмшер. М. : Прогресс, 1989.

8. Старагрэцкая драматургія / Л. П. Баршчэўскі [і інш.] ; пад аг. рэд. Л. П. Баршчэўскага. Мінск : Зміцер Колас, 2020.

9. *Тахо-Годи А. А.* Греческая мифология. М. : Искусство, 1989.

10. Apollodorus. The Library. C. H. Cambridge, MA : Harvard University Press, 1921.

11. Hesiod. Theogony, Works and Days. Baltimore : Johns Hopkins University Press, 1983.
12. Homer. The Iliad. London : David Campbell Publishers Ltd., 1992.
13. Rowling J. K. Harry Potter and the Goblet of Fire. New York : Arthur A. Levine books an imprint of scholastic Press, 2000.
14. Rowling J. K. Harry Potter and the Order of the Phoenix. New York : Arthur A. Levine books an imprint of scholastic Press, 2003.
15. Sicilys Diodorus. Library of History : Loeb Classical Library. C. H. Cambridge, MA : Harvard University Press, 1935.
16. Vergil. The Aeneid. Oxford : Oxford University Press, 1953.